✓ **28 жніўня** ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі прайшла **прэзентацыя факсімільнага выдання першага «Буквара».**

Важнай падзеяй 2018 года стала завяршэнне міжнароднага навуковага выдавецкага праекта па факсімільным узнаўленні першага «Буквара». Кніга выйшла ў 1618 г. на царкоўнаславянскай мове ў друкарні Віленскага праваслаўнага брацтва Святога Духа ў Еўе. Усяго захавалася два асобнікі 1618 г. Адна з кніг была вывезеная брытанскім калекцыянерам у Лондан у пачатку XVII стагоддзя, сёння яна захоўваецца ў Бібліятэцы Мідл Тэмпл у Вялікабрытаніі. Другі асобнік знаходзіцца ў Каралеўскай бібліятэцы Даніі. На радзіме не засталося ніводнага выдання: як часта адбываецца з навучальнымі дапаможнікамі, іх проста зачыталі да дзірак. Маштабны праект па факсімільным узнаўленні выдання 1618 г. закліканы зрабіць першы «Буквар» даступным для шырокай аўдыторыі і прадэманстраваць высокую каштоўнасць культурнай спадчыны нашага народа.

✓ **28 жніўня** ў Прэзідэнцкай бібліятэцы Рэспублікі Беларусь да 100-годдзя заканчэння Першай сусветнай вайны адкрылася **выстаўка «Беларусь у Першай сусветнай вайне»** і адбылася **прэзентацыя кнігі Сяргея Бяспанскага «Служа примером бесстрашия: кавалеры полного Георгиевского креста – уроженцы белорусских губерний»**. Выстаўка зладжаная ў рамках супрацоўніцтва бібліятэкі і Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры.

У экспазіцыі прадстаўленыя выданні з рэдкага фонду бібліятэкі, а таксама фотаматэрыялы з музея. Наведнікі пазнаёміліся з рэдкімі выданнямі, кнігамі і альбомамі, прысвечанымі Першай сусветнай вайне, а таксама артыкуламі і кнігамі намесніка старшыні абласнога савета таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры, камандзіра пошукавага атрада «Зніч» С. Бяспанскага і шэрагу вядомых




Фота Наталлі КУПРЭВІЧ

*Алесь Суша дэманструе «Буквар»*